АЭС: ад прэтэнзій да ўзаемадзеяння

СТАР.3

Чым карміць дашкольніка

СТАР.5

Хто трапіць у гурт да Меладзэ?

СТАР.8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

11 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СЕРАДА № 107 (27717) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АПК: СПІСАННЯ ДАЎГОЎ НЕ БУДЗЕ

Падтрымка сельгасвытворцаў захаваецца, але не за кошт дзяржавы і народа

Указы па ўдасканаленні аграрнай палітыкі ў выпадку іх падпісання ні ў якай меры не будуць азначаць спісанне запазычанасці па крэдытах: гаворка можа ісці толькі аб рэструктурызацыі даўгоў і адтэрміноўцы па іх выплаце. Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на адпаведнай нарадзе, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

Праекты ўказаў падрыхтаваны міжведамаснай рабочай групай па рашэнні праблемных пытанняў аграпрамысловага комплексу. Гэтыя прапановы тычацца мер дзяржаўнай падтрымкі сельгасвытворцаў, дзяржаўнага заказу, крэдытна-грашовай палітыкі галіны, умоў рэструктурызацыі запазычанасці, аптымізацыі арганізацыйнай структуры, істотнага зніжэння працэнтных ставак па банкаўскіх крэдытах для прадпрыемстваў АПК.

«Падарункаў тут ніякіх няма. Ніхто нічога нікому спісваць не будзе. Усім давядзецца разлічвацца. Будзем падтрымліваць (сельгасвытворцаў), але не за кошт усёй дзяржавы і народа», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, прапанаваная сістэма захадаў павінна быць нацэлена на кропкавую падтрымку асобных праектаў у аграрнай сферы, якія абяцаюць сур'ёзную аддачу ад іх рэалізацыі.

Прэзідэнт указаў на недапушчальнасць адыходу ад мерапрыемстваў па падтрымцы АПК банкаўскіх устаноў любой формы ўласнасці, у тым ліку з замежным капіталам, якія атрымліваюць немалы прыбытак ад сваёй дзейнасці на тэрыторыі Беларусі. Адпаведныя даручэнні дадзены ў гэтай сувязі старшыні праўлення Нацыянальнага банка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў прысутным на нарадзе кіраўнікам абласцей аб безумоўнай неабходнасці выканання ў поўным аб'ёме раней дадзенага ім даручэння па стварэнні дзейснай сістэмы захадаў па падрыхтоўцы кадраў на сяле на прыкладзе найбольш паспяховых гаспадарак.

Звяртаючыся да кіраўніцтва абласцей, Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў іх увагу на недапушчальнасць прыняцця рашэнняў аб мерах па фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў АПК, уключаючы іх банкруцтва, без удзелу ўлады. «Рашэнне павінна быць за вамі, тады не будзе бандыцкай прыватызацыі праз банкруцтва», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт перасцярог удзельнікаў нарады ад празмернага захаплення свабодным цэнаўтварэннем у аграрнай сферы як спосабам вырашэння праслаўтай праблемы дыспарытэту паміж цэнамі на прамысловую прадукцыю, якую выкарыстоўваюць аграрыі, і сельскагаспадарчую прадукцыю.

Рэзюмуючы вынікі праведзеных абмеркаванняў, Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне кіраўніцтву Мінфіна і Мінэканомікі ў самы бліжэйшы час даць яму разлікі магчымых фінансавых наступстваў праектаў указаў, прапанаваных рабочай групай, для эканомікі краіны, перш за ўсё, для бюджэтнай сферы.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

12 чэрвеня 2014 года ў 11.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

ПРАКАВЕТНАЕ

КАМЕНЮ — ЖЫЦЬ, «КУСТУ» — ЗЕЛЯНЕЦЬ

Галоўная гераіня каменьскага «куста», 11-класніца Ірына РАБКАВЕЦ, не адмовілася пакрасавацца перад вёскай у сваім кляновым убранні на скутары разам з Марыяй ЧАБАНЮК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Камень Пінскага раёна застаецца адной з найбагацейшых крыніц традыцыйнай культуры Брэсцкага Палесся. Беларускія даследчыкі фальклору папаўнялі тут свае веды, напрацоўвалі матэрыял для дысертацый, манаграфій, падручнікаў і энцыклапедый. У вёсцы захаваўся адзін з летніх ахоўных абрадаў «Куст», які праводзіцца ў нядзелю на Троіцу. «Хадзілі да ку́ста»,— дагэтуль кажуць (з націскам на «у») старэйшыя жыхаркі, для якіх удзел у абрадзе — своеасаблівае вяртанне ў пару вясёлай і непаўторнай маладосці, гульня-забава, якая дае жыццёвыя сілы. А яшчэ «куст» — гэта своеасаблівая сувязь з продкамі і вера ў магічную сілу кляновай галінкі ва ўбранні галоўнай гераіні святочнага шэсця — «кусты». Нездарма жыхары чакаюць на сваіх падворках удзельнікаў абрадавага шэсця ў першы дзень «зялёнага свята».

СТАР.3

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль РУБІНАЎ, старшыня Дзяржкамісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ

«Карупцыя ў час уступнай кампаніі выключана. Ніхто: ні старшыня камісіі, ні міністр не маюць ніякага ўплыву тут. Вы ж ведаеце, як раней даймалі бацькі і прасілі. Бацькі перажываюць за сваіх дзяцей, ідуць, просяць, скардзяцца. Можна іх зразумець, але сёння сістэма сапраўды такая, што ніхто фізічна не здольны вырашыць «праблему». Прыкладна чатыры гады таму карупцыйныя праявы маглі быць пры паступленні ў ССНУ, але цяпер вырашана і гэта. Цяпер там дастаткова цэнтралізаваная сістэма атрымання заданняў, кантролю і гэтак далей».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.06.2014 г.

Долар ЗША	10140,00	▲
Еўра	13790,00	▼
Рас. руб.	295,00	■
Укр. грыўня	858,23	▼

■ Медыяпрастора

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ,

або СМІ не павінны станавіцца зброяй

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пленарнае пасяджэнне IX Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету» прайшло ўчора ў Зале алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Асаблівую ўвагу выступоўцы — палітыкі, журналісты — надавалі тэмам інтэграцыі на постсавецкай прасторы, інфармацыйнай бяспекі, праблеме свабоды і адказнасці сродкаў масавай інфармацыі. Чырвонай ніткай амаль праз усе даклады прайшоў заклік да масмедыя не быць агрэсарамі ў інфармацыйнай вайне, не сеяць ідэі варожасці, нецярпімасці, не служыць сродкам маніпуляцыі свядомасцю сваіх чытачоў, слухачоў, гледачоў.

«ЖУРНАЛІСТЫКА ПАВІННА БЫЦЬ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ»

Прывітальнае слова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам мерапрыемства зачытаў **Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.** «Сёння ва ўмовах глабальнай інфармацыйнай прасторы асабліва запатрабавана адказная і сумленная журналістыка. Ваша слова павінна збліжаць дзяржавы і народы, супрацьстаяць заклікам да варожасці, спрыяць наладжванню канструктыўнага дыялогу ў імя міру», — гаварылася ў лісце-прывітанні кіраўніка дзяржавы. У сваю чаргу Анатоль Тозік выказаў упэўненасць, што медыяфорум, на якім будуць разгледжаны як глабальныя міжнародныя праблемы, так і прафесійныя пытанні, стане значным унёскам у міжнароднае гуманітарнае супрацоўніцтва.

Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, адзначыла, што за гады свайго існавання медыяфорум значна пашырыўся як у тэматычных кірунках, так і ў складзе ўдзельнікаў.

СТАР.3

1944-2014 70 гадоў вызвалення

НА ШЛЯХУ ДА КУЛЬТУРЫ ПАМЯЦІ

На месцы лагера смерці Трасцянец пачалася праца па стварэнні сучаснага мемарыяла. Прадстаўнікі з Беларусі, Германіі, Аўстрыі і Чэхіі абмяркоўваюць, якім будзе яго сэнсавае напаўненне

Сціплы абеліск, размешчаны ўздоўж Магілёўскай шашы, а таксама невялічкія помнікі на месцы былога лагера смерці Трасцянец неўзабаве ператворацца ў сучасны мемарыял. Размовы аб гэтым вяліся даўно, не за адзін дзень распрацоўваліся і праекты будучага месца памяці. Кропкай адліку ў ажыццяўленні ідэі стала цырымонія закладкі спецыяльнай капсулы на месцы стварэння мемарыяла Трасцянец. У прысутнасці кіраўніка нашай дзяржавы прадстаўнікі з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі перадалі спісы загінулых у адным з буйнейшых канцлагераў Еўропы.

Стварэнне мемарыяла адбудзецца паэтапна. Першую чаргу будаўніцтва плануюць завяршыць да 9 мая 2015 года. Паколькі ў Трасцянцы не захавалася аўтэнтычных збудаванняў, будучы мемарыял перш за ўсё будзе ўздзейнічаць на наведвальнікаў эмацыянальна праз архітэктуру новых пабудоў.

— Будаўніцтва мемарыяла — толькі першы крок, — зазначыў **дырэктар Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ё. Раў Віктар БАЛАКІРАЎ.** — Існуе шмат прыкладаў таго, калі ёсць мемарыялы, але каля іх нічога не адбываецца. Таму вельмі важны другі крок, які заключаецца ў тым, каб напоўніць жыццём мемарыяльны комплекс. Для таго, каб ён адпавядаў таму прызначэнню, дзеля чаго ствараўся. Маецца на ўвазе інфармацыйна-адукацыйная работа, якая павінна праводзіцца на базе такіх мемарыялаў.

Сапраўды, каб вялася даследчыцкая работа, а таксама знаёмства, у першую чаргу моладзі, са злачынствамі фашыстаў у Трасцянцы, неабходна распрацаваць спецыяльную адукацыйна-педагагічную праграму. Улічваючы тое, што ў беларускім лагеры смерці загінулі жыхары і з заходнееўрапейскіх краін, гэтае месца вельмі падыходзіць для развіцця сумеснай культуры памяці.

СТАР.2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КЫРГЫЗСТАН ПЛАНУЕ ЎСТУПІЦЬ У МЫТНЫ САЮЗ ДА КАНЦА ГОДА

Кыргызстан плануе стаць паўнапраўным членам Мытнага саюза да канца бягучага года. Пра гэта ў інтэрв'ю ІТАР-ТАСС заявіў прэм'ер-міністр рэспублікі Джаамарт Атарбаеў. «Мы будзем імкнуцца да таго, каб выканаць усе свае абавязацельствы па «дарожнай карце», — сказаў ён. Паводле слоў прэм'-ера, гэты дакумент прадугледжвае завяршэнне ўсіх падрыхтоўчых мерапрыемстваў Кыргызстанам да канца бягучага года.

6 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ АД НАВАЛЬНІЦЫ Ў ГЕРМАНІІ

У федэральнай зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія (Германія) падчас навальніцы, якая разгулялася пасля рэкорднай спёкі ў ноч на аўторак 10 чэрвеня, загінулі прынамсі шэсць чалавек. Град, маланкі, парывісты вецер і дрэвы, якія ўпалі, нанеслі ўрон жылым дамам і аўтамабілям, паведамляе ВВС. Больш за ўсё пацярпела сталіца рэгіёна Дзюсельдорф. Па сведчаннях відавочцаў, пасля навальніцы ён нагадваў «зону баявых дзеянняў».

ГАЛАДАННЕ ПЕРАЗАГРУЖАЕ ІМУННУЮ СІСТЭМУ

Універсітэт Паўднёвай Каліфорніі апублікаваў нечаканае даследаванне. Аказваецца, рэгулярныя, але абмежаваныя па часе перыяды галадання, якія доўжацца не больш за 4 дні, аднаўляюць імунную сістэму. У людзей павышаецца ўзровень лейкацытаў, піша Viral Global News. Прычым галаданне можа быць асабліва эфектыўным для людзей з аслабленай імуннай сістэмай, напрыклад, для ракавых хворых. Таксама часовае адмаўленне ад ежы нівеліруе пабочныя эфекты хіміятэрапіі. Падчас галадання ствалавыя клеткі, якія знаходзяцца ў целе, пачынаюць вырабляць лейкацыты і рэгенерыруюць усю імунную сістэму ў цэлым. Адбываецца гэтага з-за таго, што цела ва ўмовах голаду спрабуе захаваць максімальную колькасць энергіі. «Пабочны эфект» гэтага працэсу — пазбаўленне ад старых, слабых або пашкоджаных імунных клетак. Характэрна: раней спецыялісты катэгарычна забаранялі галадаць хворым людзям. Але цяпер усё змянілася. Акрамя ракавых пацыентаў, галаданне паказана і пажылым людзям.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

«ВА УКРАІНЫ НЯМА ІНШАГА ВЫБАРУ, АКРАМЯ ЯК ДАМАГАЦЦА ПАРАЗУМЕННЯ З РАСІЯЙ»

Пра гэта заявіў у сваім першым пасля ўступлення на пасаду інтэрв'ю часопісу Time прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка. «Можа быць, некаторыя ўкраінцы хацелі б мець суседам Швецыю ці Канаду, але ў нас суседка — Расія,— заявіў ён.— Таму мы не можам гаварыць пра цвёрдую бяспеку без дыялогу і паразумення з Расіяй». Парашэнка паведаміў, што ў нядзелю, 8 чэрвеня, меў працяглую сустрэчу з паслом Расіі ва Украіне Міхаілам Зурабавым. Пазіцыі бакоў паранейшаму далёкія адзін ад аднаго, але ў яго захоўваецца «асцярожны аптымізм» у дачыненні да магчымасцяў аднаўлення нармальных адносін з Расіяй, сказаў прэзідэнт Украіны.

КОРАТКА

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей 10 чэрвеня сустрэўся з Часовым Павераным у справах ЗША ў Мінску Ітанам Голдрычам, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне. Бакі разгледзелі асноўныя вынікі беларуска-амерыканскіх адносін за два апошнія гады, а таксама абмеркавалі далейшыя перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і ЗША.

Банк развіцця Беларусі прафінансаваў закупку 72 школьных аўтобусаў. Будзе закуплена па 12 аўтобусаў на кожную вобласць, агульная сума спонсарскай дапамогі складзе амаль Br45 млрд.

Вучань сярэдняй школы № 8 горада Жодзіна Віктар Шыман стаў пераможцам II Міжнароднага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», які завяршыўся ў Маскве. Прадстаўнік Беларусі ўразіў усіх членаў журы пранікнёным прачытаннем урыўкаў з аповесці аб вайне «Іван» Уладзіміра Багамолава.

У Беларусі вылаў юрыдычнымі асобамі рыбы ў фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў будзе кватавацца.

■ Круглы стол

СТАРАСЦЬ — НЕ ПАТАЛОГІЯ

ПРОСТА ДА ЯЕ ТРЭБА ПАДРЫХТАВАЦЦА

Стыль жыцця старых людзей павінен стымуляваць іх да пастаяннай актыўнасці, да пачуцця адказнасці за ўласнае фізічнае самаадчуванне і псіхічнае развіццё. Сучасная ахова здароўя здольная на многае, і рост працягласці жыцця ва ўсім свеце — таму пацвярджэнне. Аднак пасля дасягнення кожнай новай узроставай мяжы неабходна шукаць у сваім акружэнні новыя арыенціры, каштоўнасці. Старасць сама па сабе, як і цяжарнасць, — не паталогія. Проста да абедзвюх трэба рыхтавацца. А калі нічога не рабіць, давядзецца цалкам залежаць ад дапамогі звонку. І добра, калі знойдзецца той, хто будзе ведаць, як і чым дапамагаць. На дзяржаўным узроўні гэтым займаюцца самыя розныя службы. Што ім па сілах — расказваюць удзельнікі нашага «круглага стала»: намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Таццяна ФЁДАРАВА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла ЖЫЛЕВІЧ, начальнік упраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Алег КАРАЗЕЙ, загадчыца 13-га герыятрычнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Святлана ЗАНСКАЯ, галоўны пазаштатны псіхатэрапеўт Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Сяргей ДАВІДОЎСКІ, галоўная медсястра Вілейскай раённай бальніцы Аксана БАРТАШЭВІЧ, старшыня праўлення міжнароднай грамадскай арганізацыі «Узаемаразуменне» Анжэліка АНОШКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР.6

«КАЛІ ХОЧАШ ЖЫЦЬ СПАКОЙНА — НЕ СТВАРАЙ ПРАБЛЕМ СВАІМ СУСЕДЗЯМ»

Як мы ўжо паведамлялі, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю вядучым СМІ Сербіі — газеце «Палітыка» і тэлерадыёкампаніі «Радыё і тэлебачанне Сербіі». Кола зададзеных пытанняў было шырокае, аб чым сведчаць і вытрымкі з інтэрв'ю кіраўніка дзяржавы, якія публікуе БЕЛТА.

Пра гандлёва-эканамічныя адносіны Беларусі і Сербіі

— Думаю, што Сербіі трэба смялей ісці на ўсход. Я разумею вашу боязь, разумею ваша жаданне ўступіць у Еўрапейскі саюз — усё гэта, можа, і адбудзецца заўтра, але людзі хочуць жыць нармальна сёння. Хіба дрэнна для Захаду, калі Сербія будзе гандляваць з Беларуссю і Расіяй, калі ў нас будуць традыцыйна нармальныя сяброўскія адносіны? Я спадзяюся, што ў Еўрапейскім саюзе разумеюць, што ў нас ёсць вялікія традыцыі, ёсць памкненні нашых народаў да супрацоўніцтва, у тым ліку гандлёва-эканамічнага. Таму ў гэтым кірунку ніякіх праблем быць не павінна, калі Еўрасаюз зыходзіць з добрых пажаданняў

Пра падзеі ва Украіне

— Развал эканомікі і высокая ступень карупцыі спарадзілі нестабільнасць у грамадстве. Людзі не маглі мірыцца з такім становішчам, калі працы ў асноўным няма, есці няма чаго, карупцыя зашкальвае, і тут яшчэ ў палітыцы пачаліся ваганні: то заключаем пагадненне аб асацыяцыі з Еўрапейскім саюзам, то потым не заключаем, то паварочваемся да Расіі, то ад Расіі… І, вядома, гэтым скарысталіся пэўныя сілы. А ва Украіне апазіцыйныя сілы былі вельмі магутнымі, і гэтым апазіцыйным сілам далі нагоду. І вельмі важны фактар — умяшанне збоку.

Гэтыя гіганцкія ўтварэнні, тыпу Еўрапейскага саюза, Расіі, Амерыкі, Кітая, дамінуюць у свеце, і, вядома, яны свае інтарэсы рэалізуюць рознымі метадамі, у тым ліку за кошт сярэдніх, малых, слабых дзяржаў. І мы, і Сербія, і тая ж Украіна — не гіганцкія дзяржавы, мы, зразумела, знаходзімся ў зоне іх інтарэсаў, як яны часта кажуць. На што я кажу: мужыкі, вы супакойцеся, дзесьці ж і нашы павінны быць інтарэсы.

Ва Украіне сёння ідзе братазабойная вайна, там брат на брата пайшоў, там забіваюць адзін аднаго. Гэта што, нармальна? Наш народ здолеў гэтага пазбегнуць. Чаму? Таму што ў аснову палітыкі мы ў свой час паклалі мір міжрэлігійны, міжнацыянальны, ніякіх канфліктаў у нас ніколі не было.

Пра адносіны з Еўрасаюзам

— Яны зразумелі, што лепш мець больш-менш стабільную Украіну і Беларусь. Таму што не бывае чужых канфліктаў, калі гэта Еўропа, украінскіх канфліктаў. Дзе гарантыя, што гэты канфлікт не перакінецца на суседнюю дзяржаву, на Польшчу, на Германію, на нашы славянскія, тут, побач размешчаныя дзяржавы? Гарантыі няма.

Калі хочаш жыць спакойна — не стварай праблем сваім суседзям і не распальвай там пажар. Еўропа, напэўна, працверазела і гэта пачынае разумець.

Пра спробы рэвізіі вынікаў вайны

Зусім нядаўна прайшло святкаванне высадкі саюзніцкіх войскаў у Нармандыі, 70-гадовы юбілей. Але гэта ўжо з такім апломбам і з такой помпай прайшло, так ужо сродкі масавай інфармацыі асвятлялі, што як быццам гэтая падзея была галоўнай у гады Другой сусветнай вайны! Я не хачу пакрыўдзіць ні англічан, ні французаў. Але я назіраў гэтае святкаванне ў Нармандыі, так гэта ўжо падавалася, як быццам французы ваявалі ўсё жыццё. Немцы Францыю прайшлі за адны суткі! За адны суткі! Які там рух супраціву быў? Гэта не параўнаць з тым рухам супраціву, які быў у Беларусі,— партызанскі рух, падпольны рух. І загінулі дзесьці каля 500 тысяч партызанаў і падпольшчыкаў толькі ў Беларусі… Пра гэта сёння спрабуюць замоўчваць. Не атрымаецца! Мы пастаянна ўсяму свету пра гэта будзем нагадваць. Рэвізія тут недарэчная. І сваю перамогу мы нікому не аддадзім.

НА ШЛЯХУ ДА КУЛЬТУРЫ ПАМЯЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таму пакуль будуецца мемарыял, гэты час патрэбна выкарыстаць для распрацоўкі сумеснай праграмы. Дзеля гэтага ў Мінску і сабраліся навукоўцы-гісторыкі, музейшчыкі і грамадскія дзеячы. У беларусаў з'явілася ўнікальная магчымасць пазнаёміцца з вопытам працы падобных еўрапейскіх мемарыялаў. Каб стварыць свой — такі, як усюды, і ў той жа час, непаўторны, нават унікальны.

У Кёльне, напрыклад, існуе Дакументацыйны цэнтр нацыянал-сацыялізму. Гэта не толькі сховішча інфармацыі, але і бібліятэка, выставачная зала, адукацыйны, навукова-даследчы цэнтр, мемарыял ахвярам нацызму. У гэтым будынку з 1935 па 1945 год знаходзілася штаб-кватэра тайнай дзяржаўнай паліцыі (гестапа). На верхніх паверхах будынка дзейнічае пастаянная экспазіцыя, прысвечаная нацысцкаму перыяду ў гісторыі Кёльна і наогул Германіі. Школьныя групы ідуць бясконцым патокам, але ўся інфармацыя прадстаўлена на нямецкай мове, так што ствараецца ўражанне, што гэты музей, хутчэй, для ўнутранага карыстання, для своеасаблівай вакцынацыі падрастаючага пакалення ад карычневай чумы.

— Па будынку адбываецца каля 1700 экскурсій і больш чым 200 мерапрыемстваў у год, чым падкрэсліваецца значэнне педагагічнай работы з насельніцтвам, — расказаў **доктар Вернер ЮНГ.** — Вядома, усё выглядае не так пагрозліва, як было ў часы нацыянал-сацыялізму. На працягу апошніх 12 гадоў кожны год фіксуем новы «рэкорд» наведвальнікаў. Нас часта пытаюць: «Ці цікавяцца маладыя людзі?» На жаль, не. Каб у іх з'явілася цікавасць, патрэбныя новыя формы і метады: усё залежыць ад таго, як падаць інфармацыю. На высокім узроўні ў нас наладжана даследчыцкая праца. Па-ранейшаму працягваецца збор дакументаў, выдаюцца асобныя кнігі і дыдактычныя брашуры.

Мемарыял у Тэрэзіенштаце, што ў Чэхіі, з'явіўся ў 1947 годзе. Асаблівая ўвага да адукацыйнай працы пачала праяўляцца толькі ў 1989 годзе. Аднак турысты, якія прыязджаюць у горад (а іх вельмі шмат), не вельмі жадаюць паглядзець месца, дзе адбываліся жорсткія злачынствы.

— Мы паспрабавалі змяніць сітуацыю, пачаўшы самі запрашаць людзей, — паведаміў **супрацоўнік мемарыяла ў Тэрэзіенштаце, доктар Войцех БЛОДЗІХ.** — З'явіліся перадумовы пераадолення бар'еру мінулага. Наш асноўны кірунак працы — даследаванне гісторыі. Мы змагаемся супраць гістарычных скажэнняў, спрабуем запаўняць белыя плямы. На базе нашага адукацыйнага аддзела праводзяцца сустрэчы з моладдзю, ладзяцца тэматычныя семінары. Праграмы разлічаны на шырокую аўдыторыю і падаюцца з улікам узросту. Таксама наладжаны дыялог са сведкамі. У межах спецыяльнага праекта са школьнікамі мы наведваем і іншыя месцы пахаванняў ва ўсёй Чэхіі.

Першае месца па наведвальнасці ў Чэхіі займае Яўрэйскі музей у Празе. Заснаваны ў 1906 годзе, ён і сёння прыцягвае ўвагу турыстаў з усяго свету. Больш ні адзін музей у свеце не мае столькі яўрэйскіх артэфактаў! Таму справядліва, што ён лічыцца адным з найбольш вялікіх сярод падобных музеяў у Еўропе.

Сёння музей уяўляе сабой комплекс будынкаў, якія захоўваюць спадчыну яўрэяў. Яго экспазіцыя налічвае больш чым 40 тысяч экспанатаў і 100 тысяч кніг. На тэрыторыі размешчаны 4 сінагогі, зала, у якой праводзяць абрады, і нават старыя могілкі.

— У нас прадстаўлены цэлы шэраг шматлікіх культурных, адукацыйных і асветніцкіх праграм, — падкрэсліла **доктар Яна ШПЛІХАЛАВА.** — Рэгулярна адбываецца апрацоўка лістоў і дакументаў перыяду Другой сусветнай вайны. Можам пахваліцца ўнікальнай калекцыяй таго часу, якая змяшчае разнастайныя матэрыялы: афіцыйныя дакументы, асабістыя рэчы, літаратурную творчасць… Шматлікія матэрыялы мы пераводзім у лічбавы варыянт і публікуем іх у інтэрнэце. Гэта вельмі карысна людзям, якія займаюцца гэтай праблемай. Асноўная частка нашых архіваў, якія мы таксама апрацоўваем, датуецца да 1945 года. Папаўняецца за кошт лістоў яўрэйскіх абшчын, якія захаваліся дагэтуль, сямейных архіваў. Таксама наладжана работа са сведкамі, размовы з якімі ў нас захоўваюцца і ў аўдыя-/відэаверсіях. Выставы, якія мы ў асноўным рыхтуем па тэме халакосту, збіраюць наведвальнікаў амаль з усяго свету.

Такім чынам, беларусам ёсць у каго павучыцца. Аднак вырашаць, якой будзе адукацыйна-педагагічная праграма ў Трасцянцы, толькі нам. Трэба мець на ўвазе, што ў многім ад гэтай канцэпцыі будзе залежаць развіццё агульнаеўрапейскай культуры памяці.

Толькі патрэбна ўлічваць адзін аспект. **Вядучы спецыяліст Дакументальнага цэнтра «Тапаграфія тэрору» Томас ЛУТЦ** папярэдзіў, што рэакцыя людзей на мемарыялы разнастайная. «Калі гаварыць аб міжнародным супрацоўніцтве, то ў большасці краін палітыка культуры памяці праводзіцца на дзяржаўным узроўні, — расказаў прадстаўнік Германіі. — Аднак тая ж Іспанія, напрыклад, у еўрапейскай дыскусіі ўвогуле не ўдзельнічае. У Германіі праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, якія тычацца культуры памяці. Праўда, спачатку тут роля нацыянал-сацыялізму замоўчвалася. Першыя дзесяцігоддзі пасля вайны ў некаторых краінах існавала культура памяці, якая падкрэслівала ролю нацыяналізму, існавала палітычная калабарацыя, улічваліся толькі нацыянальныя інтарэсы Германіі. У Беларусі культура памяці іншая. Тут улічваецца гераізм народа ў Вялікай Айчыннай вайне, палітыка арыентавана на ўвекавечванне яго подзвігу, ветэраны атрымліваюць падтрымку ў дзяржавы. Гісторыя шматгранная, і белыя плямы патрэбна ліквідаваць. І тут вельмі важна ўлічваць не толькі нацыянальныя асаблівасці, але і міжнародныя».

Вераніка КАНЮТА.

Фота БЕЛТА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЛЕТАМ ЗА КВАТЭРУ ПРАСЦЕЙ ПЛАЦІЦЬ ЗАГАДЗЯ

Як вядома, па заканадаўстве спажывец павінен заплаціць за камунальныя паслугі не пазней 25 чысла месяца, наступнага за справаздачным. Але, як заўважылі камунальнікі, летам колькасць тых, хто робіць гэта значна раней, павялічваецца. Калі зімой прыкладных сем'яў налічваецца не болей за тысячу, то цяпер іх каля паўтара-дзвюх тысяч.

На думку работнікаў магілёўскага Цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм (ЦГІС), такому становішчу спрыяе перыяд адпачынкаў.

— Штомесяц магіляўчане аплачваюць авансам 200–300 мільёнаў рублёў,— паведаміла дырэктар ЦГІС Алена Бальшакова.— Гэтыя сродкі накіроўваюцца на правядзенне бягучага і капітальнага рамонту жылога фонду і іншыя патрэбы. Такога выніку нам удалося дасягнуць у тым ліку дзякуючы гульні «Самы дысцыплінаваны плацельшчык за жыллёва-камунальныя паслугі», якая праводзіцца нашым прадпрыемствам. Адной з намінацый яе якраз з'яўляецца аплата авансам.

На жаль, ёсць і адваротныя прыклады. Сёння прыкладна па 6 тысячах асабовых рахункаў гараджан маюцца запазычанасці. З іх амаль паўтары тысячы — злосныя неплацельшчыкі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ХАЦЕЎ У ЕЎРОПУ

Грамадзянін Грузіі, 1973 года нараджэння, спрабаваў учыніць учора ўгон самалёта на маршруце Кутаісі — Мінск. Камандзір экіпажа даведаўся пра гэта з запіскі, якая змяшчала пагрозу падрыву авіялайнера і патрабаванне аб змене курсу палёту ў адну з еўрапейскіх краін, паведамляюць у прэс-службе Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі.

На борце ў гэты момант знаходзіліся 32 пасажыры, у тым ліку адно дзіця і чатыры члены экіпажа. Пасля таго, як у 6.50 самалёт ажыццявіў пасадку ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», прадстаўнікі контртэрарыстычнага ўпраўлення КДБ і групы «А» падняліся на борт для вядзення перамоў са злачынцам. Грамадзянін Грузіі ў выніку пакінуў самалёт і здаўся супрацоўнікам КДБ.

Святлана БАРЫСЕНКА.

35 КІЛАГРАМАЎ ДОЛАРАЎ

Менавіта столькі важыць тысяча сярэбраных манет вартасцю ў адзін долар кожная — груз, што хацелі кантрабандай увезці ў Беларусь. На аўтадарожным пункце пропуску «Брэст» увагу памежнікаў і служачых мытні прыцягнула машына «Мі-цубісі», якой кіраваў 46-гадовы расіянін. Калі транспартны сродак агледзелі, то сярод асабістых рэчаў заўважылі шэрыя кантэйнеры. У іх і былі складзены манеты, адчаканеныя ў 2014 годзе і прысвечаныя каралеве Елізавеце II. Расіяне везлі іх без усялякіх суправаджальных дакументаў. Груз затрыманы. Паводле папярэдняй ацэнкі, яго кошт набліжаецца да мільярда рублёў.

Яна СВЕТАВА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання МІРАНОВІЧА Міхаіла Сяргеевіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

■ Фестывалі

«БАЗАРНЫЯ» ДНІ: ЗДАБЫТКІ І ПРЫБЫТКІ

За месяц да «Славянскага базару» квіткі на фестывальныя канцэрты прададзены ўжо на суму больш за 15 мільярдаў беларускіх рублёў, што складае 57 працэнтаў ад запланаванай выручкі. Сёлета квіткі сталі паступаць у продаж яшчэ ў красавіку і порцыямі — дзеля зручнасці патэнцыйных гледачоў, патлумачыў Аляксандр СІДАРЭНКА, мастацкі кіраўнік фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

Для тых, хто прыязджае на канцэрты з розных мясцін Беларусі і не толькі, была ўведзена сістэма электронных продажаў. Але самае галоўнае тут вось што: квіткі яшчэ ёсць! І канцэртаў у праграме багата.

Акрамя традыцыйных «сольнікаў», ёсць асобныя праграмы-прысвячэнні і зборныя канцэрты, якія найбольш прывабліваюць гледачоў,— напрыклад, адкрыццё і закрыццё фестывалю. На тым жа адкрыцці, напрыклад, адначасова можна паслухаць і Стаса Міхайлава, і Філіпа Кіркорава, «Хор Турэцкага». На сцэну выйдуць «Песняры» і «Сябры», Руслан Аляхно, Тэа, Алёна Ланская, Аляксандр Рыбак, будуць і ўдзельнікі сёлетняга «Еўрабачання», але не ўсе… Але ж у нас ёсць свой конкурс, за якім таксама цікава назіраць: потым гэтыя канкурсанты могуць стаць «зоркамі».

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Меркаванне

ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎРЭГУЛЯВАННЯ ЎКРАІНСКАГА КРЫЗІСУ

6 чэрвеня 2014 адбылася падзея, якую вельмі доўга чакалі — Уладзімір Пуцін сустрэўся з новым прэзідэнтам Украіны — Пятром Парашэнкам. Заходнія лідары прыклалі велізарныя намаганні, каб гэтая сустрэча адбылася, і Уладзімір Пуцін палічыў магчымым пайсці ім насустрач.

Доўгачаканае рандэву адбылося ў Нармандыі, дзе праходзілі ўрачыстасці, прысвечаныя 70-годдзю высадкі саюзных войскаў. У мерапрыемстве быў запрошаны прыняць удзел і новы прэзідэнт Украіны, нягледзячы на тое, што яго інаўгурацыя тады яшчэ не адбылася. Прэзідэнт Францыі Француа Аланд задоўга да мерапрыемства распавядаў журналістам, што разлічвае звесці разам французскага і расійскага прэзідэнтаў, каб яны маглі пашукаць шляхі для кампрамісу.

Усяму свету ўжо зразумела, што ўкраінскі крызіс не знікне сам сабой і неабходны рашучыя крокі па яго вырашэнні з боку найбольш уплывовых краін свету. Зразумела і тое, што сілавы варыянт вырашэння, як бы ён першапачаткова ні падтрымліваўся Захадам, можа не даць станоўчых вынікаў. Барацьба з паўстанцамі па ўсім свеце мае прыкладна аднолькавыя рысы — пры дастатковай матывацыі да супраціву з іх боку яна можа доўжыцца дзесяцігоддзямі. Нават пры ўмове прамога ваеннага разгрому яны могуць лёгка «растварыцца» сярод насельніцтва і перайсці на шлях тэрактаў супраць урада.

А тое, што паўстанцы паўднёвага ўсходу здолелі пратрымацца амаль два месяцы супраць урадавых войскаў з бронетэхнікай, верталётамі і самалётамі, прымушае ставіцца да іх і іх матывацыі на працяг барацьбы досыць сур'ёзна. Ці хочуць у Еўрасаюзе, каб канфлікт такога роду дзесяцігоддзямі доўжыўся ў суседняй краіне, нават пры ўмове, што ўрадавыя сілы атрымаюць ваенную перамогу, заліўшы крывёю паўсталыя гарады Украіны? Пры ўсім жаданні абразіць Расію, разграміўшы яе прыхільнікаў на тэрыторыі Украіны, відавочна, што Еўрасаюзу зусім не выгадна мець магутную крыніцу тэрарыстычнай актыўнасці ў сябе пад бокам. Значыць, прыйдзецца дамаўляцца.

Міністр замежных спраў Францыі Ларан Фабіус, каментуючы заяву Парашэнкі аб імкненні Украіны ўвайсці ў ЕС, адзначыў, што ЕС не гатовы да гэтага, і Украіна «павінна падтрымліваць добрыя адносіны як з ЕС, так і з Расіяй».

Фактычна Кіеву далі апошні шанц вырашыць пытанне сілай за два тыдні пасля ўкраінскіх прэзідэнцкіх выбараў. Гэта было тэстам на яго здольнасць ўсталяваць мір. Але, як аказалася, кінуўшы велізарныя сілы на падаўленне мецяжу, украінская ўлада асабліва не атрымала поспеху. Значыць, неабходна дамаўляцца ўжо яе магутным суседзям. А вось тут ужо без Расіі ніяк не абысціся.

Таму трэба адзначыць, што на самой справе куды большай значнасцю для перспектыў вырашэння ўкраінскага крызісу мелі асабістыя сустрэчы Уладзіміра Пуціна з заходнімі палітыкамі падчас мерапрыемства. Тыя ўмовы ўсталявання міру на Украіне, якія Пуцін абмяркоўваў з імі, мелі найбольшае значэнне. Сустрэча ж з Парашэнкам была, галоўным чынам, сімвалічнай. Яе задачай было падкрэсліць, што Расія прызнае новую ўладу ва Украіне і тым самым бачыць у ёй легітымны бок для дасягнення пэўных дамоўленасцяў з Захадам.

Тое, што ўвага ўсяго свету была прыцягнута да гэтай сустрэчы, і яе важнасць, можна ацаніць ужо па першых рэпартажах, зробленых тут жа. Заходнія СМІ апавясцілі свет, што прэзідэнты паціснулі адзін аднаму рукі, расійскія — што Пуцін не стаў паціскаць руку Парашэнку. Праўда, неўзабаве аказалася, што расійскія СМІ памыліліся, і яны хутка выправіліся.

А неўзабаве з'явіліся і першыя абнадзейлівыя сігналы аб тым, што абодва ўзроўні сустрэч Пуціна — і з лідарамі Захаду, і з прэзідэнтам Украіны — мелі патэнцыял для вырашэння ўкраінскіх праблем. Падчас сваёй інаўгурацыйнай прамовы Пётр Парашэнка, выказаўшыся супраць федэралізацыі Украіны і дзвюх дзяржаўных моў, у той жа час выказаў гатоўнасць да амністыі часткі ўдзельнікаў супраціву, прыхільнасць да курсу дэцэнтралізацыі рэгіёнаў і прыняцця мер па вырашэнні эканамічных праблем Данбаса.

Пасол Расіі ва Украіне Міхаіл Зурабаў, каментуючы інаўгурацыйную прамову Парашэнкі, заявіў, што «як дэкларацыя аб намерах яна, у прынцыпе, гучыць абнадзейліва». Кіраўнік МЗС Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер заклікаў Кіеў выкарыстоўваць сілу на ўсходзе краіны «асцярожна і з пачуццём меры». Сімптаматычная і заява прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ. Выступаючы пасля цырымоніі інаўгурацыі Пятра Парашэнкі, яна заявіла аб неабходнасці ўрэгуляваць украінскі канфлікт мірна: «Вайна наогул не выйсце, усе праблемы трэба вырашаць за сталом перамоў, шляхам дыялогу і, самае галоўнае, слухаць і чуць, у тым ліку і вашы ўсходнія рэгіёны».

Міністр замежных спраў Францыі Ларан Фабіус, каментуючы заяву Парашэнкі аб імкненні Украіны ўвайсці ў ЕС, адзначыў, што ЕС не гатовы да гэтага, і Украіна «павінна падтрымліваць добрыя адносіны як з ЕС, так і з Расіяй».

У нядзелю таксама ў Кіеве прайшло пасяджэнне кантактнай групы па рэалізацыі мірнага плана, падчас якога Пётр Парашэнка заявіў аб неабходнасці спыніць агонь на працягу тыдня. На ім прысутнічалі пасол Расіі і спецыяльны прадстаўнік генеральнага сакратара АБСЕ Хайдзі Тальявіні.

Усё гэта сведчыць аб тым, што ў перспектыў урэгулявання канфлікту мірным шляхам з'явілася будучыня. А вось наколькі яна будзе радаснай, залежыць ужо ад вытрымкі ўсіх бакоў канфлікту.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

14 июля 2014 г. проводит открытый аукцион № 13-А-14
на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 8 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона, и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	пер. 2-й Вязынский	500000000006007239	0,1668	объект общественного обслуживания/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	324 688 630	49 000 000	20 809 042	Обязательства землепользователя по регистрации имущественных прав на земельный участок, а также по своевременному проектированию объектов и освоению земельного участка.
2	ул. Космонавтов	500000000005006820	0,3600	кафе с развлекательным детским центром/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	718 483 080	108 000 000	25 502 253	
3	ул. Ромашкина – ул. Авиации (микрорайон Сокол)	500000000004005139	0,2519	торгово-обслуживающий объект/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	332 235 200	50 000 000	17 869 506	
4	ул. Ромашкина (микрорайон Сокол)	500000000004005148	0,1000	кафе/ земельный участок для размещения объектов общественного питания	131 891 320	20 000 000	19 901 293	
5	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004369	0,1037	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	239 012 640	30 000 000	16 319 683	
6	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004367	0,1028	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	236 944 680	30 000 000	14 264 174	
7	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004368	0,1347	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	310 466 100	35 000 000	15 978 882	
8	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004387	0,1800	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	418 539 300	63 000 000	16 232 710	

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 14 июля 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 9 июля 2014 г. в вышеуказанном (графа 7 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. № 6, с 12 июня 2014 г. по 9 июля 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия не менее двух участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона; протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (в предусмотренных законодательством случаях) в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

До истечения срока аренды земельного участка (5 лет) лицо, которому он предоставлен по результатам аукциона, в установленном порядке и сроки обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок в аренду на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72,
официальный сайт организатора аукциона:
www.mgcn.by.

■ Энергетыка і экалогія

АД ПРЭТЭНЗІЙ ДА КАНСТРУКТЫЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Да запуску БелАЭС плануецца як мінімум тры візіты інспектараў МАГАТЭ

Вынікі шостай нарады бакоў па Канвенцыі Эспа (дакументе аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце) задаволілі беларускую дэлегацыю, адзначыла на сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Ія Малкіна.

Удзельнікі нарады, якая праходзіла ў Жэневе (Швейцарыя), падвялі вынікі дзейнасці, прынялі некалькі значных рашэнняў, а таксама падрабязна абмеркавалі пытанні ўздзеяння на навакольнае асяроддзе пры рэалізацыі праектаў у галіне гідра- і ветраэнергетыкі і асаблівасці ўжывання Канвенцыі Эспа для розных праектаў у сферы энергетыкі, у тым ліку ядзернай.

— Па выніках выбараў у працоўныя органы канвенцыі ў іх склад увайшоў і прадстаўнік Беларусі, — расказала Ія Малкіна. — Гэта вельмі добрая ацэнка нашай дзейнасці. Тым больш што беларускія эксперты зрабілі вялікі ўклад у ліквідацыю існуючых недакладнасцяў ва ўжыванні Канвенцыі Эспа.

Беларусь заўсёды актыўна ўдзельнічае ў міжнародным супрацоўніцтве. З 2001 года, калі яна яшчэ не з'яўлялася ўдзельніцай канвенцыі, тут прымаліся на нацыянальным і міжнародным узроўні заканадаўчыя, адміністрацыйныя і іншыя захады па забеспячэнні эфектыўнай ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. З 2009 па 2010 гг. у нашай краіне прайшла рэформа нацыянальнага заканадаўства з улікам уласнай і міжнароднай практыкі, якая сёння дэманструе свае пазітыўныя вынікі.

Па словах першага намесніка міністра, гэты факт пацвярджаюць і міжнародныя эксперты. Так, аналіз нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, праведзены камітэтам па ажыццяўленні Канвенцыі Эспа, паказаў, што паміж працэдурай правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ў Беларусі і канвенцыяй адсутнічаюць неадпаведнасці.

Адным з асноўных для Беларусі пытанняў, што разглядаліся падчас нарады, стала скарга з боку Літвы, звязаная з будаўніцтвам Беларускай АЭС.

Як расказала Ія Малкіна, па выніках абмеркавання і галасавання нарада бакоў ухвалі ла праект рашэння ў дачыненні да Беларусі з улікам прапаноў Еўрапейскага саюза. Нягледзячы на некаторыя разыходжанні з пазіцыяй нашай дэлегацыі, прынятае рашэнне ў цэлым задаволіла беларускі бок.

Так, нарада бакоў даручыла камітэту па ажыццяўленні канвенцыі прааналізаваць зробленыя літоўскім і беларускім бакамі крокі і прадставіць даклад па гэтым пытанні на сёмай сесіі.

Акрамя таго, краіны — удзельнікі канвенцыі заклікалі Беларусь у якасці меры па павышэнні даверу між бакамі запрасіць місію МАГАТЭ па ацэнцы пляцоўкі будучай атамнай электрастанцыі, прыроднага ўздзеяння на гэтую пляцоўку і запасу трывалasці АЭС у сувязі з гэтым уздзеяннем. Беларуская дэлегацыя згадзілася ажыццявіць гэту прапанову.

Як адзначыла першы намеснік міністра, наша краіна даўно супрацоўнічае з МАГАТЭ, у тым ліку і па пытаннях па рэалізацыі нацыянальнай ядзерна-энергетычнай праграмы. Місіі міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі ўжо неаднаразова наведвалі Беларусь. Да запуску ў эксплуатацыю Беларускай АЭС плануецца яшчэ тры візіты міжнародных экспертаў.

— Калі гэтых місій недастаткова, мы гатовыя пайсці насустрач і запрасіць яшчэ адну, — сказала Ія Малкіна. — Галоўнае, каб гэта спрыяла дасягненню кансэнсусу і ўзаемнай зладжанай працы, у тым ліку і з Літвой. Нарада бакоў, якая адбылася, выразна прадэманстравала, што літоўскаму боку пара пераходзіць да канструктыўнага ўзаемадзеяння з нашай краінай — мы адкрытыя для дыялогу і гатовыя да сумеснай працы.

Вераніка КОЛАСАВА

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

Фотадзымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Прымяняюцца, як вядома, аральныя кантрацэптывы монафазныя — калі выкарыстоўваецца адналькавая доза на працягу ўсіх дзён прыёму, і трохфазныя — калі дазіроўкі эстрагенаў павялічваюцца на працягу трох фазаў цягам месяца, — тлумачыць **загадчык кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Людміла МАЖЭЙКА.** — У жанчын бывае ў сярэднім каля 12 менструацый у год. Максімум у 8-і цыклах выспяваюць яйцаклеткі, астатнія — фізіялагічна анавуляторныя. Кантрацэптыў «Клайра» займае ўнікальную нішу сярод супрацьзачаткавых таблетак, паколькі, кажучы простай мовай, дае вось такую прыродную анавуляторнасць, ён не ўмешваецца ў гарманальны баланс...

«Клайру» могуць прызначаць жанчынам усіх узроставых груп — ад зусім юных да 55 гадоў. СААЗ не ўстанаўлівае ніякіх абмежаванняў па працягласці выкарыстання аральных кантрацэптываў, а значыць, імі можна карыстацца шмат гадоў запар, з перапынкамі на жаданыя цяжарнасці. Больш за тое, некаторыя навуковыя даследаванні ўказваюць на фактар зніжэння рызыкі анкалагічнай захваральнасці малочнай залозы, яечнікаў, эндаметрыю, тоўстай кішкі на фоне ўжывання аральных кантрацэптываў цягам некалькіх гадоў. Прычым пры шмат гадоў пасля спынення ўжывання кантрацэптыву рызыка не ўзрастае.

Пры выкарыстанні аральнага кантрацэптыву ў арганізме захоўваецца фізіялагічны ўзровень гармонаў, пры гэтым яечнікі «адпачываюць», што з'яўляецца «плюсам» для арганізма. Так захоўваецца запас яйцаклетак, а яечнікі зберагаюцца ад механічных пашкоджанняў у працэсе авуляцыі.

У 20 працэнтах выпадкаў цяжарнасць наступае праз месяц пасля адмены аральных кантрацэптываў, у астатніх выпадках — на працягу года.

70 працэнтаў цяжарнасцяў у беларусак лічацца запланаванымі. Чым заканчваюцца астатнія (незапланаваныя) — статыстыка не фіксуе. Аднак у апошнія гады, як сцвярджаюць спецыялісты, працэнт непажаданых/незапланаваных цяжарнасцяў у Беларусі зніжаецца. Вядома, што на падлеткавую групу цяжарных прыпадае менш за 2 працэнты ўсіх штучных перарыванняў цяжарнасці. Сярод жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту гэты паказчык складае 11,4 на 1000 жанчын фертыльнага ўзросту.

■ 14 чэрвеня — Сусветны дзень донара крыві

РАТАВАННЕ НЕЗНАЁМЦА

Дэвіз сёлетняй кампаніі — «Бяспечная кроў для ратавання маці». Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўказвае такім чынам на своечасовы доступ да бяспечнай крыві для папярэджвання мацярынскай смяротнасці. У свеце яшчэ застаюцца выпадкі гібелі жанчын ад ускладненняў цяжарнасці і родаў. Асноўная прычына — цяжкая страта крыві. Амаль усе гэтыя выпадкі адбываюцца ў Паўднёвай Афрыцы і Паўднёвай Азіі.

Штогод прыкладна 160 тысячам пацыентаў бальнічных арганізацый аховы здароўя нашай краіны пераліваюць донарскую кроў. Забяспечыць неабходныя запасы можна толькі пры ўмове рэгулярнай здачы крыві добраахвотнымі неаплатнымі донарамі.

— Нашы арганізацыі аховы здароўя ў поўным аб'ёме забяспечаны неабходнымі кампанентамі крыві і лекавымі сродкамі, якія атрымліваюць з плазмы крыві, уключаючы забеспячэнне гематрансфузійнага (з пераліваннем крыві) суправаджэння высокатэхналагічных аператыўных умяшанняў, — паведамляе **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Генадзь ХУЛУП.** — Летась упершыню за 80 гадоў існавання служба крыві перавысіла нарыхтоўку плазмы. Наогул удалося перавыканаць усе паказчыкі дзейнасці.

Летась у краіне пачалася актыўная работа па развіцці бязвыплатнага донарства. Арганізатарамі такога донарства з'яўляюцца ўсе медработнікі, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні. Усяго ў бязвыплатным донарстве ў 2013 годзе ўзялі ўдзел 3600 чалавек.

У Беларусі каля 80 тысяч кадравых донараў крыві і звыш 10 тысяч кадравых донараў плазмы.

Колькасць кровадач у 2013 годзе — 39 на 1000 жыхароў Беларусі.

Кроў і прадукты крыві лічаць унікальным рэсурсам, які можна атрымаць толькі ад людзей, якія здаюць кроў або яе кампаненты. Самымі бяспечнымі лічацца донары-добраахвотнікі — альтруісты, якія адчуваюць маральны доўг і сацыяльную адказнасць. У іх няма падстаў утойваць інфармацыю пра свой лад жыцця ці медыцынскі стан, які робіць здачу крыві немагчымай. Адзінай узнагародай тут становяцца самапавага і гонар. **СААЗ заклікала ўсе краіны да 2020 года перайсці на сістэму рэгулярнага бязвыплатнага добраахвотнага донарства крыві.**

Сярод асноўных прынцыпаў нацыянальнай палітыкі забеспячэння донарства крыві і яе кампанентаў — поўнае самазабеспячэнне краіны якаснымі кампанентамі і лекавымі сродкамі з плазмы крыві, стварэнне дастатковага запасу. Асаблівая ўвага надаецца бяспецы ў акушэрскай і педыятрычнай практыцы. Створаны запасы плазмы, усіх груп крыві, уключаючы рэзус-адмоўную, выкарыстоўваецца тэхналогія атрымання «дзіцячых доз» кампанентаў крыві.

У межах пілотнага праекта ствараецца электронная база даных донараў крыві і яе кампанентаў, штрых-кадзіраванне донарскай дакументацыі прадуктаў крыві.

Назіранні за донарамі, якія здаюць кроў на працягу многіх гадоў, не выявілі ў гэтых людзей ніякіх адхіленняў, звязаных з кровадачамі. Спецыялісты заклікаюць грамадства паразважаць над тым, што нават калі чалавек па стане здароўя не можа быць донарам, ён павінен далучыцца да донарскага руху ў якасці прапагандыста.

— Паводле статыстыкі, адна данацыя можа выратаваць да 3 жыццяў, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Ала РАДЗЮК.** — Патраціўшы трэць гадзіны ў пункце здачы крыві, вы можаце падарыць жыццё некалькім людзям. У сярэднім мужчыны могуць здаваць кроў 5 разоў на год, жанчыны — 4. Па сутнасці, за год донар можа выратаваць 12 чалавек! Кроў донара з'яўляецца ўнікальным і незаменным лекавым сродкам. Нават самыя дарагія прэпараты могуць аказацца бессэнсоўнымі, калі жыццё чалавека залежыць толькі ад своечасова пералітай крыві.

ДОНАРСТВА ПЛЮС... ФРЫСТАЙЛ

У 6-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска да донарства далучыліся і беларусы, чые імёны на слыху: Святлана Грышына (мастацкая гімнастыка), Дзмітрый Дашчынскі (фрыстайл), Андрэй Стась і Дзмітрый Мільчакоў (хакейны клуб «Дынама-Мінск»), Вадзім Дзевятоўскі (кідальнік молата), Ірына Бойцік (дызайнер), Яна Станкевіч (прадзюсар), Юлія Кур'ян (ПУП «Промафільм»).

Дарэчы, адным з самых вядомых донараў з'яўляецца аўстраліец Джэйм Харысан, якога донарская кроў выратавала ў 13-гадовым узросце. У 18-ць ён сам свядома стаў донарам. За сваё жыццё гэты чалавек здаў кроў амаль 1000 разоў, і яго рэдкая група крыві дапамагла выжыць немаўлятам з цяжкай формай анеміі. Гэта неверагодна, але яго кроў выратавала, паводле прыблізных падлікаў, 2 млн нованароджаных!

■ Інфарм-укол

ЧЫМ КАРМІЦЬ ДАШКОЛЬНІКА?

У харчаванні дзяцей павінны прысутнічаць усе асноўныя групы прадуктаў — хлеб, мяса, рыба, малако і малочныя прадукты, садавіна, агародніна, макарона, крупы, жывёльныя і раслінныя тлушчы і г.д. Без рэкамендацый урача не садзіце дзіця на дыету, не рабіце яго вегетарыянцам. Задача дарослага, які клапоціцца пра здароўе дзіцяці, — забяспечыць разнастайнае меню, а не адшукаць спосаб звузіць яго любым чынам да пары-тройкі прадуктаў. Не варта заходзіцца ў істэрыцы, калі дзіця выказвае жаданне паласавацца марожаным, цукеркамі, піцай, чыпсамі, гамбургерам, каўбаскай. Але такія прадукты ніяк не могуць быць асноўнай, штодзённай ежай, нагадвае інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ.

З мяса выбірайце нятлустую ялавічыну, цяляціну, курыцу, індычку.

З рыбы — траску, хек, мінтай, судак. Кансервы і салёныя далікатэсы — зрэдку.

Малако і малочныя прадукты нельга скідваць з рахунку з-за бялку, кальцыю, фосфару, вітаміну B_2.

Хлеб, макарона, аўсяныя і грэцкія крупы, алей з агароднінай — не забудзьцеся на іх.

Рэжым харчавання — не менш за 4 разы на дзень. 25% сутачнай каларыйнасці павінна прыпадаць на сняданак, 40% — на абед, 15% — падвячорак, 20% — вячэру.

СНЯДАНАК. Трэба даваць кашу або яечныя, тварожныя стравы; мяса, рыбу, хлеб з маслам, сырам. Чай або кававы напой з малаком.

АБЕД. Салат з агародніны; мясны, курыны ці рыбны суп (з агароднінай і крупамі), мяса, птушку або рыбу з гарнірам, на дэсерт — кісель, кампот, напой са свежых пладоў/ягад, фруктовае пюрэ.

ПАДВЯЧОРАК 1. Шклянка малака, кефіру ці сыраквашы, пячэнне, булачка.

ПАДВЯЧОРАК 2. Садавіна, сокі.

ВЯЧЭРА. Стравы з агародніны або круп (каб не паўтараць сняданак), смажаныя мясныя або рыбныя стравы даваць не варта.

Не рэкамендуецца ў харчаванні дашкольніка: вэнджаная каўбаса, кансервы, тлустае мяса, перац, гарчыца, таматная паста, кетчуп, наогул вострыя стравы і прыправы. Для паляпшэння смаку можна дабавіць пятрушку, кроп, сельдэрэй, зялёную ці рэпчатую цыбулю, часнок. Яны будуць яшчэ стрымліваць рост мікробаў у арганізме. Смак ежы паляпшаецца, калі выкарыстоўваць сок журавін ці лімона, любыя сухафрукты.

Газіраваныя напоі трэба выдаліць з рацыёну і замяніць на чай з малаком, кававы напой з малаком, сокі, адвар шыпшыны.

У якасці салодкага рэкамендуюцца: зефір, мармелад, пасціла, мёд, джэм, варэнне.

Апытанні бацькоў выявілі, што многія дзеці недаатрымліваюць ёдаванай солі, малака і малочных прадуктаў, рыбы і рыбных прадуктаў, мяса і мясных прадуктаў. Разам з тым кандытарскія і хлебабулачныя вырабы складаюць 80% ад агульнага рацыёну. Кашы замяняюцца піцамі і чыпсамі. Гарачыя стравы з мяса і рыбы — сасіскамі і каўбасой. А паколькі часта і самі дарослыя харчуюцца няправільна, то гэта становіцца нормай для ўсёй сям'і.

— Харчаванне дзяцей, асабліва дашкалят, павінна адрознівацца ад харчавання дарослых.

— Пажадана гатаваць дзецям на пары або запякаць.

— Прадукты і стравы не павінны паўтарацца на працягу дня.

— Дома трэба даваць дзіцяці тое, што ён недаатрымаў у дзіцячым садку або школе.

— Можна прапускаць сняданак дома, каб дзіця паснедала ў садку.

У 3-гадовым узросце варта вучыць паводзінам за сталом:

✓Сядзець прама, не абапірацца на локці. Карыстацца лыжкай. Тлумачыць, у якой руцэ трымаць нож, у якой — відэлец.

✓Выпрацоўваць звычку жаваць павольна, з закрытым ротам. Пры дрэнным апетыце нельга ладзіць шоу — дазваляць глядзець тэлевізар або абяцаць усякія ўзнагароды. Гэта ніяк не паляпшае апетыт!

✓Есці толькі ў спакойным стане. За сталом не высвятляць адносіны.

✓Не даваць больш, чым можна з'есці. Лепей пасля крыху дабавіць.

✓З-за стала не адпускаць з ежай у руках. Дзіця павінна ведаць, што выйсці з-за стала можна толькі па завяршэнні працэсу харчавання і з дазволу старэйшых.

✓Дзіця павінна падзякаваць за ежу, прыбраць свой посуд, памыць рукі і апласнуць рот.

Усё гэта вельмі хутка стане нормай, калі самі дарослыя будуць падаваць прыклад.

■ Псіхалогія для ўсіх

ЗАЗІРНІЦЕ... У СЯБЕ!

Калі мы імкнёмся рэалізаваць нейкую мэту — атрымаць адукацыю, выхаваць дзяцей, зрабіць кар'еру, то абавязкова трапляем пад нейкі ціск, пэўныя ўстаноўкі — прыносіць карысць людзям, умець рабіць тое, што трэба, а не тое, што падабаецца, браць адказнасць за свае словы і ўчынкі. Словам, трэба быць важным чалавекам, а не ганяцца за «задавальненнем». У такім падыходзе ёсць супярэчнасці. Па-першае, ніхто не кажа пра важнасць такіх рэчаў, як захапленне сваёй справай (а значыць, свае жаданні!), апантанасць ідэяй, бляск у вачах. Ніхто не спрачаецца, што добра рабіць тое, што робіцца з душой, аднак насамрэч пра «душу» ніхто не клапоціцца. Урэшце ўсе звыкаюцца з тым, што гэта дробязь. Мы прыгадваем пра гэту дробязь, толькі калі жыццё становіцца прэсным.

— Сум жыцця праяўляецца ў адзіноце, — расказвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена БРЫЦКО.** — Можна бегаць ад яе, займаючыся працай, захапляючыся стасункамі з цікавымі людзьмі. Быццам бы ўвесь час заняты, няма калі выспацца... А варта прыпыніцца — і нараджаецца туга па нечым іншым. Іншай працы, краіне і г.д. Час ідзе, а ты аказваешся ў шэрагу тых, хто даўно змагаецца з адзінотай. Здаецца, трэба знайсці іншага чалавека, які і будзе рашэннем. І можна знайсці гэтага Іншага чалавека, заказацца, кінуцца ў адносіны і растварыцца...

Можна доўга шукаць прычыны таго, як атрымалася, што мы лічым сябе тым, хто не заслугоўвае ўвагі. Або, наадварот, у сваёй саманадзейнасці не дапускаем магчымасці памылак і таму не глядзім на сябе, не дазваляем сябе шкадаваць. У кожнага свая гісторыя. Але праўда ў тым, што **дарослы чалавек павінен сам даглядаць... стасункі з самім сабой! Умець гэта рабіць і азначае быць дарослым.** Можна пачаць з маленькіх крокаў. Пастаўцеся да сябе сур'ёзна, як да самага важнага чалавека ў жыцці. Паступова вам давядзецца навучыцца ахоўваць уласныя межы, спыняць усе спробы ўсё перабольшваць і рабіць памылковыя высновы. Але ўсё гэта ўжо не будзе пакутай ад адзіноты. Вы запоўніце пустэчу сабой.

Спытайце ў сябе: што я пра сябе ведаю? Я цікаўлюся сабой? Які ў мяне стыль мыслення? Стыль работы? Характар? Як я кантактую з іншымі? Чым я падобны да людзей майго ўзросту? Чым не падобны? Ці памятаю я пра свой узрост, вагу? Чаго я баюся? Куды не хачу зазірнуць? Проста пералічыце, можаце не паглыбляцца. Паспрабуйце зразумець: ці адчуваеце вы цікавасць да сябе? Калі вы ў цішыні і сам-насам з сабой, якія пачуцці перажываеце? Калі вы вельмі даўно не былі ў добрых адносінах з самім сабой, без слёз не абысціся. Столькі ўсяго трэба аплакаць, пашкадаваць сябе як след. Плачце, пакуль не з'явіцца цеплыня, якая пераадольвае разрыў з сабой. У жыцці шмат сітуацый, калі мы становімся інструментам у чужых руках, дазваляем сабой карыстацца. Кожны раз пасля гэтага трэба пашкадаваць сябе, каб зноў адчуць уласную цэласнасць.

Некалі было лепш: і вада была макрэйшая, і трава зялянейшая. Мы тужым па мінулым, у якім нібыта было лепш. Аднак **нашы вяртанні ў гэта мінулае сведчаць пра тое, што ў ім засталося шмат «неадрэагаваных» перажыванняў, незадаволеных патрэб.** Калі такое адбываецца, псіхіка спрабуе вярнуць нас туды і «закрыць» гэтую патрэбу. Выкінуць з галавы ранішнюю спрэчку не атрымліваецца, таму што давялося выслухаць папрокі і нічога не сказаць у адказ. Магчыма, вы проста «адсутнічалі» ў тым месцы ў той час. Той, хто рэгулярна знаходзіцца не тут і не цяпер, губляе кантакт з самім сабой, сваімі пачуццямі і патрэбамі. Адсюль незадаволенасць, туга або апатыя. Бегаючы з мінулага ў будучыню і назад, вы не паспяваеце зразумець, чаго вам хочацца, і пачаць выконваць свае жаданні.

Няўменне жыць сучасным шкодзіць і адносінам. Мы ўпускаем важныя моманты: ад добрых учынкаў да здрады. Здаровыя стасункі можна ладзіць, знаходзячыся толькі тут і цяпер. Яны патрабуюць пастаяннага ўзаемадзеяння са сваімі пачуццямі. Без іх немагчыма бачыць чалавека такім, які ён ёсць насамрэч. Нам цяжка бачыць рэальную сітуацыю. Нас многае палохае. І мы ўцякаем ад непрыемных пачуццяў, думак, звязаных з імі спраў. Мы ігнаруем гэта, пераключаем увагу на нешта нязначнае. Мы думаем, што гэта не тое, што трэба, або не ўпэўнены, што нешта атрымаецца. Страшна нават пачаць. Пачуццё віны аднімае сілы, робіць нас стомленымі. Пры гэтым прыходзіць стрэс, які вызваляе энергію, — і мы бяромся за справы. Аднак тое, што робіцца ў стрэсе, неэфектыўнае. Выбягаючы з дому на працу ў апошні момант, мы думаем пра спіс спраў у офісе, у метро не можам прыгадаць, ці выключылі прас, ці замкнулі дзверы. Рэгулярная забыўлівасць — таксама вынік уцёкаў ад цяперашняга моманту. Забыўлівасць можа з'явіцца на фоне затоеных трывог і страхаў. **Унутры нас адбываецца нешта маштабнае, што аднімае шмат псіхічных сіл, але мы гэта ігнаруем.** Дыскамфорт з-за таго, што акаляе ў рэальнасці, перасяляе нас у свет віртуальны. Падумайце, што менавіта вы не жадаеце заўважаць у сабе і сваім жыцці? І пачынайце вяртацца да самога сябе. Гэты працэс — вяртання ў «тут і цяпер» — патрабуе вялікага асэнсавання.

1. Назірайце за сабой, за сваімі думкамі. Гэта не значыць, што трэба перастаць планаваць або звяртацца да мінулага досведу. Аднак, калі вы прыгадваеце, як на вас накрычалі, варта зразумець, што вашы магчымасці адрозніваюцца ад тых, што былі раней. Вярніцеся ў бягучы момант і дзейнічайце.

2. Адарвіцеся ад інтэрнэту. Сетка дае нам адчуванне падманнага задавальнення. Гэта ўсё роўна што харчавацца цукеркамі: смак прыемны, але арганізму — ніякай карысці. Проста азірніцеся навокал, паглядзіце на тое, што вас акаляе. Не выходзьце на аўтапілоце з дому, не выключайце аўтаматычна камп'ютар. Ацэньвайце сэнс дзеянняў.

3. Баіцеся, што не здолееце нешта зрабіць? Нешта не разумееце? Разбярыцеся ў сабе. Рухайцеся ад нервознасці ў бок засяроджанасці. Урэшце, мыць посуд з сумным настроем лепей, чым не мыць наогул.

4. На што ў гэтую секунду рэагуюць вашы цела і душа? У дзяцінстве вас вучылі гэта заглушаць (не набывай у краме тое, што не будзеш насіць!). Набываць, можа, і не трэба, але не варта і праскоквацца міма. Гэта тыя моманты, у якіх мы радуемся жыццю і адчуваем свае патрэбы.

5. Калі арыентавацца на вынік, працэс проста знікае. Што з вамі адбываецца, калі вы ідзяце на працу? Настойліва перабіраеце паперкі? Гэтыя думкі ніяк не дапамогуць справе, але дакладна пазбавяць прыемнай прагулкі.

P.S. *Навучыцца мастацтву жыць цяпер можна з дапамогай практык, скіраваных на самапазнанне: ёга, медытацыя, цыгун, спевы мантраў. Гэта канцэнтруе чалавека на целе і тых працэсах, што ў ім адбываюцца, на псіхіцы і пачуццях. Гэта вяртае ў бягучае і ўсведамленне сябе ў ім.*

Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

СТАРАСЦЬ — НЕ ПАТАЛОГІЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КАМУ І КОЛЬКІ?

Таццяна ФЁДАРАВА: — У краіне пражывае каля 130 тысяч адзінокіх непрацаздольных грамадзян, сярод якіх ёсць і пажылыя. Гэта людзі, якія не маюць паўналетніх дзяцей, мужа або жонкі, бацькоў. Унукі, пляменнікі тут не ўлічваюцца. Пажылыя, якія яшчэ захавалі фізічную актыўнасць і якім неабходны штодзённыя стасункі з равеснікамі, могуць наведваць аддзяленні

дзённага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тым, каго абмяжоўвае дрэнная самаадчуванне, прапануюцца сацыяльныя паслугі на даму. А тыя, хто страціў магчымасць да самаабслугоўвання, размяшчаюцца ў стацыянарныя ўстановы. **На даму адзінокія малазабяспечаныя грамадзяне абслугоўваюцца бясплатна.** У дамах-інтэрнатах агульнага тыпу (іх па краіне 23) і аддзяленнях кругласутачнага знаходжання (іх 59) адзінокія пажылыя могуць аплачваць паслугі на льготнай аснове. **Усе, хто мае родных, але пражывае асобна, абслугоўваюцца на ўмовах поўнай аплаты.** Калі ж мы маем справу з нядобрасумленнымі дзецьмі, якія, скажам, злоўжываюць алкаголем, а сам пажылы чалавек не можа аплаціць паслугі па поўным кошце з-за малой пенсіі, выканкам прымае рашэнне аб паніжэнні аплаты ці вызваленні ад яе.

«Звязда»: — Як звычайна выяўляюцца гэтыя неабароненыя катэгорыі? Людзі самі павінны прасіць сацыяльнай дапамогі?

Таццяна ФЁДАРАВА: — Штогод тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва абследуюць умовы пражывання адзінокіх грамадзян і высвятляюць, хто і ў чым мае патрэбу. Камусьці аказваецца садзейнічанне ў рамонце печы, камусьці — у рамонце або замене электраправодкі... Дарэчы, для большай зручнасці **ў сельскай мясцовасці адкрываюцца сацыяльныя пункты — філіялы цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання.** Наша служба падтрымлівае сувязь і з сельсаветамі, дзе таксама можна атрымаць сацыяльна важную інфармацыю. Вяскоўцаў наведваюць і мабільныя брыгады сацабслугоўвання — арганізуюць візіт патрэбных спецыялістаў (юрыста, псіхолага, г.д.).

Самымі запатрабаванымі ў нашых адзінокіх і адзінока пражываючых пажылых з'яўляюцца сацыяльна-бытавыя паслугі (дастаўка тавараў, лекаў, сувязь з медустановамі, прыбіранне ў доме, добраўпарадкаванне прысядзібнага ўчастка, расчыстка снегу і г.д.). Яны прадастаўляюцца па нізкіх цэнах або наогул бясплатна. Акрамя гэтага, у кожным раёне распрацоўваецца свой пералік, згодна з якім паслугі прадастаўляюцца па больш высокім тарыфе (колка дроў, рамонт плота, прысядзібных пабудоў, пашыў і рамонт пасцельнай бялізны, паслугі сацыяльнай пральні, цырульні і г.д.).

Святлана ЗАНСКАЯ: — Дапусцім, я 80-гадовая вясковая бабуля, якой цяжка хадзіць. Што мне зрабіць, каб атрымаць дапамогу сацыяльнай службы?



Таццяна ФЁДАРАВА: — Звярнуцца ў сельскі Савет, які накіруе да сацыяльнага работніка. Той заключыць з вамі дагавор на аказанне патрэбных паслуг. Іх аплата ў асноўным адбываецца на месцы, перадаецца сацработніку.

«Звязда»: — У рэдакцыю прыйшоў такі ліст ад чытачкі: «Мне 60 гадоў, пенсія — 1 млн 460 тысяч. Звярнулася па тэлефоне ў сацаддзел Нясвіжскага райвыканкама па матэрыяльную дапамогу... Там сказалі сабраць дакументы і прывезці. А потым прыехаць яшчэ па канчатковае рашэнне. Значыць, трэба аплаціць чатыры паездкі — у Нясвіж і назад... Ісці я не магу, а грамадскі транспарт ходзіць рэдка... Як жа атрымаць тую дапамогу?»

Трэба імкнуцца максімальна доўга захоўваць самаабслугоўванне, заставацца актыўным. А на дзяржаву давайце разлічваць у самых крайніх выпадках.

Таццяна ФЁДАРАВА: — Замест адзінокіх састарэлых грамадзян, якія па стане здароўя маюць патрэбу ў старонняй дапамозе, заява запаўняцца спецыялістам тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Калі ў вас няма групы інваліднасці, значыць, давядзецца ехаць самой. Патрэбны толькі пашпарт, працоўная кніжка і пенсійнае пасведчанне. Калі чалавек рэалізуе прадукцыю з прысядзібнага ўчастка, то і даведкі аб яе рэалізацыі. Атрымаць пасля адрасную сацыяльную дапамогу можна на пошце, у аддзяленні банка або, з нядаўняга часу (адзінокім пажылым, якім больш за 70 гадоў, і адзінокім інвалідам 1 і 2 груп), — дзякуючы службе дастаўкі пенсіі. Праўда, яны пакуль працуюць толькі ў Мінску і Маладзечне... Акрамя таго, вы спачатку самі можаце пралічыць, ці ёсць сэнс звяртацца па такую дапамогу. Атрымаць адпаведную кансультацыю можна і па тэлефоне.

Сяргей ДАВІДОЎСКІ: — З ліста не вынікае, ці ёсць у гэтай жанчыны родныя, блізкія... Няўжо зусім няма каму дапамагчы ў такім простым пытанні? Сапраўды, дзяржава павінна клапаціцца пра неабароненыя катэгорыі грамадзян — інвалідаў, адзінокіх... Але ў першую чаргу маладзейшыя блізкія, сваякі не павінны забывацца на пэўны клопат. У нас часам дзеці выпіваюць усе сокі з бацькоў, якія працуюць, а як тыя пачынаюць жыць на мізэрную пенсію, дык цалкам забываюцца на іх. Ды яшчэ часам заяўляюць: маўляў,

няхай дзяржава клапоціцца... Не, шаноўныя, гэта найперш ваш абавязак.

ПАЛІКЛІНІКА ЯК КАВЯРНЯ

Людміла ЖЫЛЕВІЧ: — У многіх краінах прыйшлі да высновы, што любая форма стацыянарнага догляду горшая за амбулаторную. Словам, неабходна дома стварыць чалавеку такія ўмовы, каб ён мог там заставацца. Гэта добра і для фізічнага, і для псіхічнага здароўя. У Фінляндыі, напрыклад, агульная медыка-сацыяльная служба штодня вызначае, каму і які від дапамогі сёння патрабуецца. Калі адзінокі пацыент выпісваецца са стацыянара, работнік медыка-сацыяльнай брыгады прапануе яму мадэрнізаваць жыллё — размясціць поручні ў ванным пакоі, перанесці выключальнікі, каб да іх лягчэй было дацягнуцца... **У Еўропе сёння ўсё больш кажуць пра неабходнасць па максімуме рабіць усё для таго, каб чалавек заставаўся дома.** Гэта і грамадству выгадна, і якасць жыцця чалавека павышае.

70 працэнтаў нашых пажылых маюць 7-9 хранічных захворванняў. 30 працэнтаў з іх маюць патрэбу ў медыка-сацыяльным доглядзе, і гэта асноўныя наведвальнікі нашых паліклінік... Усё жыццё чалавеку не хапала часу на прафілактыку захворванняў, і вось на пенсіі, нарэшце, з'явіўся час заняцца сваім здароўем! Як толькі гараджанін выходзіць на пенсію, ён зранку пачынае хадзіць не толькі ў магазін, але і ў паліклініку. У тым ліку і каб падтрымліваць стасункі — з урачамі, знаёмымі. Мы ўжо жартуем, што трэба пры паліклініках адкрываць кавярні... У вяскоўцаў — агарод, свойская жывёла. А гараджанін або бясконца ходзіць у паліклініку, або сядзіць дома, набірае вагу ды памнажае фактары рызыкі развіцця дэменцыі.

Таму сёння назіраецца рост аб'ёмаў аказання медыцынскай дапамогі пажылым гараджанам. Па наведваннях паліклінік у нас самы высокі паказчык у Еўропе. Дзякуй Богу, у сельскай мясцовасці мы збераглі ФАПы з фельчарамі ў малых вёсках. Гэта вельмі цэніцца нашымі вясковымі грамадзянамі. Але ёсць катэгорыя асоб, якія патрабуюць доўгачасовай дапамогі. І тут не абысціся без бальніц сястрынскага догляду. Іх

пажылых людзей адзінокіх і каля 8 тысяч адзінока пражываючых, а бальніца сястрынскага догляду ў раёне разлічана на 25 ложкаў. Усіх адзінокіх узяць на зіму ў такую бальніцу немагчыма. А таму створаны дамы сезоннага пражывання, дзе старыя жывуць у ацяпляльны сезон. Яны разам аплачваюць камунальныя паслугі, да іх прыходзіць сацыяльны работнік. Для дзяржавы гэта абыходзіцца значна танней. А ў бальніцу сястрынскага догляду мы бяром адзінокіх, з якімі не справіцца надомная сацыяльная служба, — ляжачых, з пераломамі. Хворы падлечваецца і накіроўваецца ў інтэрнат. Адной з функцый бальніцы сястрынскага догляду з'яўляецца якраз афармленне ў інтэрнат.

Таццяна ФЁДАРАВА: — Мы ўжо ўзялі на ўзбраенне стацыянарзамяшчальныя формы сацыяльнага абслугоўвання і будзем актыўна іх развіваць. Да 1986 года адзінай формай сацабслугоўвання ў нашай краіне былі дамы-інтэрнаты. Пасля з'явілася сацыяльная дапамога на даму. Сёння ў нас на такім абслугоўванні 88 тысяч пажылых (у дамах-інтэрнатах агульнага тыпу знаходзяцца больш за 4 тысячы чалавек). У аддзяленнях дзённага знаходжання не толькі арганізаваны адпачынак, але і ажыццяўляецца догляд непрацаздольных. **Паступова хочацца ўкараніць штосьці кшталту дзіцячага садка для пажылых.** Такую магчымасць ацэняць дзеці і ўнукі тых старых, якіх лепш было б пакінуць пад наглядам на нейкі час.

У розных рэгіёнах краіны ў нас дзейнічаюць і іншыя стацыянарзамяшчальныя формы. Гэта «дамы зімоўкі», калі двое, трое суседзяў аб'ядноўваюцца на зімовы час, жывуць у адным доме, дзе іх наведвае сацыяльны работнік. «Дом самастойнага пражывання» — гэта калі пустуючы ў сельскай мясцовасці жылы дом прыводзіцца ў нармальны тэхнічны стан, у яго засяляюцца непрацаздольныя грамадзяне, якія не маюць жылля або якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Патранат ажыццяўляе ўсё той жа тэрытарыяльны цэнтр, сельвыканкам. Ёсць яшчэ прыёмная, гасцявая, патранатная сем'і, ствараюцца дамы самастойнага сумеснага знаходжання, санаторый на даму.

У сталіцы працягваецца работа па ўкараненні рэнтавых адносін. Пры гэтым атрымальнік рэнты перадае сваё жылое памяшканне ва ўласнасць Мінска, а Мінгарвыканкам як плацельшчык рэнты, са свайго боку, ажыццяўляе пажыццёвае ўтрыманне грамадзяніна. Дагавор пажыццёвага ўтрымання заключаецца з мінчанамі, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту і не маюць у Мінску асоб, абавязаных па законе іх утрымліваць.

БЯГОМ, БЯГОМ...

Святлана ЗАНСКАЯ: — Ці нельга стварыць нейкую інфармацыйную сацыяльную службу, дзе можна было б атрымаць усю падобную інфармацыю?

Таццяна ФЁДАРАВА: — З 1 студзеня 2015 года ўсёй краіне будзе даступна такая інфалінія. Можна будзе атрымаць даведачную інфармацыю і кансультацыі спецыялістаў міністэрства. Дарэчы, і цяпер у міністэрства паступае шмат званкоў аб дапамозе. Паверце, мы разбіраем кожную сітуацыю.

Сяргей ДАВІДОЎСКІ: — Дарэчы, сітуацыі бываюць вельмі розныя. Старыя могуць быць і не адзінокімі па факце (ёсць і дзеці, і іншыя сваякі), і нават пенсія ў некаторых не самая малая... Але ім, з аднаго боку, можа сапраўды не хапаць поўнай інфармацыі аб тым, як вырашыць тое ці іншае пытанне. З другога боку, я хацеў бы нагадаць пра некаторыя важныя моманты, над якімі павінен працаваць кожны з нас. І дзяржава тут ні пры чым. Яшчэ пакуль мы не выйшлі на пенсію, трэба захоўваць і падтрымліваць кантакты з сябрамі і калегамі па працы, умацоўваць кантакты з блізкімі, спрабаваць сілы ў самых розных відах дзейнасці — выхаванні ўнукаў, вядзенні хатняй гаспадаркі, грамадскай дзейнасці... Варта імкнуцца максімальна доўга захоўваць самаабслугоўванне, заставацца актыўным. А на дзяржаву давайце разлічваць у самых крайніх выпадках.

Людміла ЖЫЛЕВІЧ: — Падтрымаю калегу па двух момантах... Адна мая бабуля была нехадзячай, а другая, як кажуць, бегала. Ляжачая штовечар надзявала сваю любімую брошку і а 18-й гадзіне чакала «вестак з палёў».

— Ну што? — сустракала ляжачая тую, што бегала. Тая пачынала расказваць навіны. Уся гэта інфармацыя перапрацоўвалася да наступнага дня, мозг актыўна працаваў... Гэтыя стасункі былі вельмі важнымі для абедзвюх, асабліва для той, што мела фізічныя абмежаванні.

Яшчэ факт. Ляжачую жанчыну дзеці навучаюць работе са скайпам. Дзеці сяброўкі гэтай жанчыны таксама навучаюць сваіх «старых». У выніку ўсе аказваюцца настолькі занятымі перамовамі, абмеркаваннем, асэнсаваннем атрыманай інфармацыі, што там

нак, знайсці цікавы занятак для таго, хто пражывае адзін або вымушаны заставацца ў адзіноце, пакуль сваякі на працы. І калі мы будзем пакідаць усё гэта толькі на дзяржаўныя сацыяльныя і медыцынскія ўстановы, то далёка не прасунемся.

Неабходныя ўмовы ствараюцца з дапамогай такой праграмы, як «Месца сустрэчы: дыялог». Яе рэалізуюць некалькі грамадскіх арганізацый, іх валанцёры — часам агульнымі намаганнямі з сям'ёй пажылога. Часта ўзаемадзейнічаем пры гэтым з цэнтрамі сацабслугоўвання. У Гомелі, напрыклад, адзін падапечны 11 гадоў не мог размаўляць пасля інсульту. І раптам заспяваў! Дзеля

Дзеці выклікалі да сваёй састарэлай маці ўрача. Доктар пытаецца: колькі ваша «бабуля» ў коме? А дзеці кажуць: не ведаем. Як высветлілася, яны тыднямі за шафу не заглядвалі!

такіх вынікаў у межах праграмы шэраг грамадскіх арганізацый рэалізуюць у розных рэгіёнах Беларусі 87 праектаў! Словам, вопыт падтрымкі пажылых, веданне іх асноўных патрэб ёсць, аднак ёсць і такая праблема: няўхільнае старэнне прыводзіць у рэшце рэшт да страты мабільнасці, адразу пачынае ўздыхаць: як жа я стамілася ад грамадскага жыцця! Яна там бегае з аднаго мерапрыемства на другое. То адным займаецца, то іншае распрацоўвае... Нам абавязкова трэба браць гэта на ўзбраенне.

Анжэліка АНОШКА: — У нас не выхавана патрэба жыць і пра адзіноту немагчыма гаварыць, і памяць трэніруецца...

Аднак я прыгадваю і такі факт з медыцынскай практыкі. Дзеці выклікалі да сваёй састарэлай маці ўрача. Доктар пытаецца: колькі ваша «бабуля» ў коме? А дзеці кажуць: не ведаем. Як высветлілася, яны тыднямі за шафу не заглядвалі! Або ёсць сітуацыі, калі дапамога патрэбна не толькі састарэламу бацьку, але і немаладому сыну. Бо аднаму — за 90, другому — за 70, ды яшчэ ёсць унук-інвалід...

ПАТРАБУЕЦЦА... ВЯЛІКАЕ СЭРЦА

Анжэліка АНОШКА: — Цалкам згодна, што пажылы павінен, наколькі гэта магчыма, заставацца ў хатняй абстаноўцы. Адна з мэт нашай праграмы, якая фінансуецца германскім фондам «Памяць, адказнасць і будучыня», менавіта так і гучыць. Аднак прыстасаваць жыллё, вядома, яшчэ не ўсё. Важна падтрымліваць «баявы» настрой. Для гэтага неабходна арганізаваць адпачы-

а мадэляў валанцёрскай працы з такімі людзьмі фактычна няма. Дэфіцыт ідэй звязаны ў асноўным з адсутнасцю прафесійных ведаў і навыкаў. Неабходна аб'ядноўваць намаганні грамадскіх арганізацый, валанцёраў і органаў аховы здароўя, сацабароны. Для самих грамадскіх арганізацый важна ведаць, на якое менавіта ўзаемадзеянне можна было б тут разлічваць, якім мог бы быць удзел кваліфікаваных спецыялістаў. Мы хацелі б падтрымліваць сем'і, якія даглядаюць пажылых (немабільных, са зніжэннем інтэлекту), навучаць сваякоў такому догляду. І мы хацелі б, каб нас таксама вучылі нечаму ў гэтым накірунку.

Людміла ЖЫЛЕВІЧ: — Ведаеце, тут часцей не патрабуюцца нейкія асабліва глыбокія веды. Хіба, псіхалагічная падрыхтоўка. Ды вялікае сэрца. Вопыт паказвае, што патрэбную колькасць прафесіяналаў не падрыхтуеш ніколі. Звычайна самай эфектыўнай аказваецца дапамога людзей, якія пабывалі ў падобнай сітуацыі і знайшлі падыходы. Вось іх трэба ўцягваць у валанцёрскі рух больш актыўна.

Грамадскім арганізацыям наогул неабходна працаваць не толькі ў сацыяльным кірунку. Неяк прыязджаю ў вёску, пытаюся: «Хто ў вас староста?» Няма. «Хто наогул галоўны?» Няма. Людзі не ведаюць, дзе знаходзяцца тыя, хто павінен ведаць іх ледзь не па імёнах! А варта пазваніць пажылой сяброўцы ў Францыю, як тая адразу пачынае ўздыхаць: як жа я стамілася ад грамадскага жыцця! Яна там бегае з аднаго мерапрыемства на другое. То адным займаецца, то іншае распрацоўвае... Нам абавязкова трэба браць гэта на ўзбраенне.

Анжэліка АНОШКА: — У нас не выхавана патрэба жыць грамадскім жыццём. Мая дачка працуе валанцёрам ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту — выкладае бабулям нямецкую мову, камп'ютарную адукацыю. Яе равеснікі гэтага не разумеюць: навошта патрэбна бясплатная грамадская нагрузка?

А ведаеце, як мы заахвочвалі адных пажылых працаваць з іншымі? Першых пажылых валанцёраў мы запрасілі спачатку на забаўляльныя праграмы, камп'ютарныя курсы. Потым прапанавалі навучыцца карысным навыкам на курсах Чырвонага Крыжа, пасля замацавалі за кожным такім валанцёрам «свайго» пажылога. І кожная пара працавала па той схеме, якая была зручнай для абодвух — проста званкі, або сустрэчы, або гульні. Нехта нават адпачываць у санаторый парай ездзіў... Варта, аказваецца, пачаць.

Таццяна ФЁДАРАВА: — Якраз для таго, каб пажылыя даўжэй заставаліся актыўнымі, сацыяльныя паслугі пераважна маюць на мэце менавіта садзейнічанне пажылым, а не выкананне нечага замест іх. Яшчэ хацелася б сказаць пра дзяржаўны сацыяльны заказ — форму ўзаемадзеяння дзяржавы і недзяржаўных некамерцыйных арганізацый па аказанні сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. У яго рамках магчыма субсідзіраванне дзейнасці недзяржаўных некамерцыйных арганізацый. Памер субсідыі можа дасягаць 50% кошту праекта і вызначаецца мясцовымі органамі. Сёння ўжо заключаны 24 дагаворы ў 23 рэгіёнах рэспублікі. Сярод асноўных выканаўцаў дзяржсацзаказу — Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа, якое бярэ на сябе медыка-сацыяльны догляд на даму людзей, якія па некаторых прычынах не могуць абслугоўвацца тэрытарыяльнымі цэнтрамі. Тут у рамках дзяржзаказу аплачваецца праца медыцынскіх сясцёр міласэрнасці. Грамадскія арганізацыі мы заклікаем больш актыўна звяртацца ў мясцовыя органы ўлады са сваімі прапановамі.

Варта пазваніць пажылой сяброўцы ў Францыю, як тая адразу пачынае ўздыхаць: як жа я стамілася ад грамадскага жыцця! Яна там бегае з аднаго мерапрыемства на другое.

ДЗЕ ЦЯЖКА, ТАМ «ПРАБЕЛ»

Святлана ЗАНСКАЯ: — Не будзем забываць пра вельмі неабароненую групу пажылых людзей з дэменцыямі — узроставым зніжэннем інтэлекту. Садкі дзённага знаходжання, пра якія гаварылася вышэй, — проста мара! У тым ліку для катэгорыі сваякоў псіхічна хворых. Куды дзяваць такіх старых, пакуль дзеці працуюць?

У РНПЦ псіхічнага здароўя існуюць аддзяленні, куды шпіталізуюцца пацыенты з дэменцыямі і наяўнасцю псіхозу. У шэрагу выпадкаў мы атрымліваем сур'ёзнае паляпшэнне стану хворага, яго разумовых функцый. Бо сёння ёсць пэўныя методыкі вядзення такіх пацыентаў, ёсць сучасныя медыкаменты. Расцягванне часу прагрэсавання захворвання вельмі важнае. Сваякі атрымліваюць магчымасць звыкнуцца з тымі зменамі, што адбываюцца з іх блізкім.

Выдатна, калі падобныя пацыенты з першымі праявамі зніжэння інтэлекту будуць звяртацца да псіхіятра, атрымліваць патрэбную дапамогу, але ў наступныя перыяды абвастрэння дэменцыі сваякі павінны накіроўвацца ўжо не ў медустанову, а ў сацыяльную службу. Пажылыя, пра якіх я кажу, не павінны заставацца ва ўмовах клінікі назаўжды. Адзінокіх жа людзей з глыбокімі парушэннямі неабходна размяшчаць у профільны псіханеўралагічны інтэрнат. Але тут ёсць праблема са своечасовым афармленнем: існуе чарга. Па Мінску гэтая чарга можа доўжыцца ад 2 да 7 гадоў! Але дзе ўвесь гэты час павінен знаходзіцца адзінокі і сур'ёзна хворы стары? У нашым цэнтры? Гэта нерэальна. Для дзяржавы стацыянарнае лячэнне ў псіхіятрычнай установе абыходзіцца вельмі дорага. Мы закідваем сацыяльную службу лістамі: маўляў, дайце пуцёўку ў дом-інтэрнат хоць бы для недзеяздольных! Аднак...

Таццяна ФЁДАРАВА: — Праблема чаргі датычыцца, галоўным чынам, жыхароў сталіцы, куды многія дзеці забіраюць сваіх састарэлых бацькоў. У іншых рэгіёнах з гэтым прасцей. А на даму такіх пацыентаў не абслугоўваюць. Ствараць жа міні-інтэрнаты на даму — затратна.

Святлана ЗАНСКАЯ: — У тым ліку і таму, што проста не знойдзеш ахвотных абслугоўваць такую катэгорыю старых. У нашым аддзяленні працуюць усё ж такі некалькі спецыялістаў, а вось з хатнімі ўмовамі атрымліваецца прабел.

ЦЕРПЯЦЬ ДА АПОШНЯГА

Людміла ЖЫЛЕВІЧ: — У межах нядаўняга пілотнага праекта ў Кармянскім і Брагінскім раёнах Гомельскай вобласці была створана комплексная брыгада, у якую ўваходзілі прадстаўнікі праваахоўнай і сацыяльнай службаў, медыкі. Мы паспрабавалі выпрацаваць схему ўзаемадзеяння пры аказанні дапамогі пажылым пацыентам. Працавалі і са сваякамі пажылых. Гэта была спроба абазначыць нашы функцыі, навучыць адно аднаго нейкім асноўным рэчам. Спадзяёмся, што гэты кірунак будзе развівацца.

Святлана БАРЫСЕНКА, Святлана БУСЬКО. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Звязда»: — Ці мае Міністэрства ўнутраных спраў напрацаваныя падыходы па выяўленні старых, якім патрэбна падтрымка?

Алег КАРАЗЕЙ: — У працэсе работы — падчас прафілактычных мерапрыемстваў або раскрыцця злачынстваў — мы, безумоўна, сутыкаемся з праблемамі пажылых. Нават калі разваленую печ заўважаем у доме, то паведамляем пра гэта супрацоўнікам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Факты любога неўладкавання не пакідаюцца без увагі, інфармацыя накіроўваецца ў мясцовыя органы ўлады. За 4 месяцы гэтага года 2 769 пенсіянераў пацярпелі ў выніку злачынстваў. Гэта прыкладна столькі ж, колькі за адпаведны час мінулых гадоў. У краіне наогул кожнае другое злачынства — гэта крадзеж. Таму і не дзіўна, што ахвярамі ў гэтым выпадку часта становяцца даверлівыя пажылыя. Асабліва сяльчане, якія жывуць без стальных дзвярэй і спецыяльных ахоўных сістэм.

Калі ў такога жыхара ёсць хоць бы невялікі стабільны даход — пенсія, а побач пражывае непрацуючы алкаголік, то вось вам і самы распаўсюджаны варыянт злачынства...

Вось злачынца разбіў шкло, адчыніў дзверы, залез у хату. Закрыў рукой рот ахвяры, прыставіў нож да горла і запатрабаваў грошай... У выніку за атрыманыя 22 тысячы рублёў, дзве бляшанкі шпротаў і ліхтарык давядзецца пазбавіцца волі мінімум на 5 гадоў.

Пажылыя людзі нярэдка становяцца ахвярамі і махлярства. Страчваюць логіку і набываюць у старонніх людзей рэчы па значна завышаным кошце. Дапусцім, у дом прыходзяць людзі з наборам каструль, які на рынку каштуе капейкі, а даверлівы пенсіянер аддае за яго палову пенсіі. Вядома, у межах спецыяльнага комплекснага мерапрыемства «Увага: узрост!» нашы супрацоўнікі тлумачаць і расказваюць, што нездарма незнаёмыя людзі наведваюцца да вас у дзень пенсіі. Рэкамендуем карыстацца пластыкавымі карткамі — усё ж такі плаціць па ёй можна ўжо і ў вясковых крамах.

«Звязда»: — Старыя часам аказваюцца неабароненымі і ад самых блізкіх сваякоў...

Алег КАРАЗЕЙ: — Блізкія нярэдка і адбіраюць грошы, і збіваюць. А на сваіх родных старыя скардзіцца не жадаюць. Прадухіліць такія злачынствы, бытавы гвалт — праблема... Ніводзін выяўлены факт не застанецца без рэагавання з боку праваахоўнікаў. Пажылы чалавек проста павінен аднойчы набраць 102. На жаль, у большасці выпадкаў яны гэта не робяць, а гвалт, які меў месца аднойчы, абавязкова некалі здарыцца зноў. Часам суседзі, знаёмыя ведаюць сітуацыю, але маўчаць. Наша насельніцтва звычайна закрывае вочы на тое, што адбываецца навокал. І патурае новым злачынствам.

Мы займаемся нават пагрозамі і няцяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі. Аднак пакуль не атрымаем заяву ад пацярпелага, не можам прыцягнуць крыўдзіцеля да адказнасці. Толькі ў выпадку, калі чалавек мае псіхафізічныя асаблівасці (не размаўляе, абмежаваны ў руху, пакутуе ад псіхічнага захворвання і г.д.), якія перашкаджаюць абараняць свае правы, або ён знаходзіцца ў залежным становішчы, за справу можа ўзяцца непасрэдна пракурор.

Наша служба зацікаўлена ў выяўленні нават самых «дробных» фактаў парушэння правоў. І не абавязкова за «лёгкае» правапарушэнне крыўдзіцель адразу ж трапіць за краты, як таго баяцца звычайна матулі сыноў-алкаголікаў... Аднак з апошнімі будзе праведзена прафілактычная размова. І, магчыма, мы папярэдзім больш сур'ёзнае злачынства.

Учыненне на працягу года трох любых адміністрацыйных правапарушэнняў пагражае медыцынскім аглядам, які выяўляе, ці ёсць захворванне на алкагалізм/наркаманію і ці няма проціпаказанняў да размяшчэння ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Далей выносіцца афіцыйнае папярэджанне аб магчымым накіраванні ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Калі на працягу года пасля гэтага ўчыняецца любое адміністрацыйнае правапарушэнне ў стане алкагольнага ап'янення, то афармляецца накіраванне ў ЛПП. Гэтыя ўстановы ў нас сёння перапоўнены. На працягу года там аказваецца каля 6 тысяч чалавек.

Сёння плануецца ўнесці заканадаўчыя змяненні, згодна з якімі будзе магчымым датэрміновае спыненне знаходжання ў ЛПП. Звычайна накіраванне выдаецца на 1 год.

Аднак калі праз 6 месяцаў знаходжання грамадзянін зарэкамендуе сябе як законапаслухмяны (не парушаў працоўную дысцыпліну, не меў ніякіх заўваг з боку адміністрацыі), то суд можа разгледзець і датэрміновае вызваленне. Гэта наўрад ці будзе мець масавы характар, але, тым не менш, мы зможам крыху паскорыць працэс накіравання ў вышэйзгаданыя прафілакторыі. Бо ў нас сёння ёсць выпадкі, калі рашэнне суда ўступіла ў сілу, а свабодных месцаў няма. Пастаянна каля тысячы чалавек па краіне чакаюць сваёй чаргі. На жаль, ёсць у нас і факты таго, што падчас гэтага чакання накіраваныя ўчынялі новыя злачынствы...

У кожнага ўчасткавага ёсць так званы пашпарт адміністрацыйнага ўчастка, дзе пазначана колькасць насельніцтва, арганізацый, судзімых і г.д. У тым ліку пазначаюцца і грамадзяне, якія пражываюць самастойна або з асобамі асацыяльных паводзін. Ступень алкагалізацыі насельніцтва ў рэгіёне — вельмі важны момант у статыстыцы злачынстваў. Наогул 90 працэнтаў самых цяжкіх злачынстваў учыняецца ў стане алкагольнага ап'янення. Таму мы спрабуем больш актыўна працаваць у прафілактычным кірунку.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	9	2 120 089,8	1 994 321,9
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		5 634,2	9 241,7
4	Средства в Национальном банке	1103	6.1	13 383 906,5	19 684 061,8
5	Средства в банках	1104	6.3	6 303 459,1	3 596 345,4
6	Ценные бумаги	1105	6.2	15 761 974,4	11 635 470,6
7	Кредиты клиентам	1106	6.3	112 469 710,8	84 543 145,2
8	Производные финансовые активы	1107	6.7	4 544 856,8	3 872 209,6
	Инвестиции в зависимые юридические лица		4	118 109,3	79 089,9
	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	6.4	5 087,3	4 837,5
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	6.5	5 378 517,7	4 047 403,8
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	6.6	7 777,6	299,8
	Деловая репутация			-	-
12	Прочие активы	1111	6.7	1 171 971,1	907 659,7
13	**ИТОГО активы**	**11**		**161 271 094,6**	**130 374 086,9**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201	6.8	4 921 000,1	6 708 107,2
16	Средства банков	1202	6.8	21 782 554,4	13 755 231,3
17	Средства клиентов	1203	6.8	100 239 976,0	78 941 748,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	6.8	9 825 702,9	8 705 042,5
19	Производные финансовые обязательства	1205	6.8	1 451,7	272,9
20	Прочие обязательства	1206	6.8	1 038 950,8	945 579,5
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**137 809 635,9**	**109 055 982,3**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211	6.9	16 687 552,6	16 187 552,6
24	Эмиссионный доход	1212		98,1	98,1
25	Резервный фонд	1213		1 108 430,1	823 633,8
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	6.9	2 910 060,5	2 181 231,0
27	Накопленная прибыль	1215	6.9	2 754 854,2	2 125 188,1
	Всего капитал, принадлежащий головной организации-банку			23 460 995,5	21 317 703,6
	Доля неконтролирующих акционеров			463,2	401,0
28	**ВСЕГО капитал**	**121**		**23 461 458,7**	**21 318 104,6**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**161 271 094,6**	**130 374 086,9**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011	7.1	18 367 844,6	17 933 029,9
2	Процентные расходы	2012	7.1	14 594 396,5	13 238 314,5
3	Чистые процентные доходы	201	7.1	3 773 448,1	4 694 715,4
4	Комиссионные доходы	2021	7.2	1 945 309,8	1 398 483,7
5	Комиссионные расходы	2022	7.2	684 783,8	460 524,9
6	Чистые комиссионные доходы	202	7.2	1 260 526,0	937 958,8
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	7.5	2 576,1	3 482,4
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	7.3	(13 119,8)	(18 962,7)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	7.3	152 627,9	467 665,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	7.5	688 205,6	160 376,2
11	Чистые отчисления в резервы	207	7.4	691 682,5	2 111 273,2
12	Прочие доходы	208	7.5	552 624,3	503 563,5
13	Операционные расходы	209	7.6	3 519 697,3	2 767 058,7
14	Прочие расходы	210	7.6	723 892,7	513 066,6
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		1 481 615,7	1 357 400,3
16	Налог на прибыль	212		115 743,2	136 935,1
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**1 365 872,5**	**1 220 465,2**
	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			30 738,4	17 290,9
	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			**1 396 610,9**	**1 237 756,1**
	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку			1 396 607,7	1 237 752,4
	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			3,2	3,7
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22	8	86	76
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала						
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего капитал, принадлежащий головной организации-банку	доля неконтролирующих акционеров	всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
